**Вашкевіч, А.** Полымя Афгана / А. Вашкевіч // Лепельскі край. — 2006. — 1 верас. — С. 2.

**ПОЛЫМЯ АФГАНА**



Спачатку жыццё ішло па традыцыйнай раскладцы: школа, тэхнікум, першае каханне, абпаліўшае вусны трапяткім пацалункам і... дарога дальняя. На службу ў Афган.

Доўга грукаталі вагонныя колы. Пераехалі Волгу, і Крым, здаецца застаўся ўбаку, а поезд, усё едзе і едзе па бясконцаму Саюзу. Казахстан, Таджыкістан. І вось на гарызонце бліснула халоднае лязо Амудар'і.

Выгрузіліся ў Тэрмезе, які да таго быў набіты воінскімі часцямі, што нагадваў сабой нейкі табар часін татара-мангольскага нашэсця.

– Пастроіцца! – прагучала каманда.

Зрабілі пераклічку – і ў палатку-лазню. Пасля доўгай дарогі аблілі вядром вады кожнага – вось і ўсё мыццё.

Пяць месяцаў правёў у «вучэбцы». І вось размеркаванне. Іх афганская «кропка» знаходзілася ля пасялення Мазары-Шарыф. Саламяныя стрэхі, сцены з гліны. Ні звыклай для нас травы, ні дрэў. Толькі горы, пясок. Сяргей Якута быў вадзіцелем тэхмайстэрні, накшталт лятучкі. Суправаджалі калоны з грузамі, жывой сілай.

– На вайне, як на вайне, – кажа суразмоўца.

Суха, каратка, неахвотна. Падумалася, як жа да цябе падступіцца, герой Афгана, як расштурхаць? Выручае маці Аляксандра Іванаўна… Гутарка ажывае пакрысе, а мой блакнот напаўняецца фактамі. Байцы заставы жылі з мясцовымі жыхарамі, можна сказаць, у згодзе. Праўда, у госці не хадзілі, авось па гаспадарцы дапамагалі. Але былі яшчэ і «духі». Яны абстрэльвалі заставу, наладжвалі засады на адзінай дарозе. Бралі на прыцэл снайперы. У адным з баёў загінулі восем нашых салдат, адбіліся, зразумела.

Прывезлі восем загінуўшых у драўляных скрынках. Якута і яго напарнік атрымалі загад абпаяць рагі і вуглы, а потым усё гэта «апрануць» у металічную бляху. Цынкавыя труны на бронетранспарцёры дастаўлялі ў аэрапорт. Далейшы шлях загінуўшых ужо як «груз-200» транспартаваўся ў Саюз. З ім ляцелі і суправаджаючыя. Ім прадстаяла сустрэча з бацькамі...

– У нашай часці быў такі выпадак. Выстраліў душман з гранатамёта. Граната ўрэзалася ў жывот салдату, на шчасце, не ўзарвалася. Чатыры хірургі рабілі аперацыю ў бронежылетах і касках. Паспяхова. За праяўленую мужнасць у баі і пры выздараўленні таму салдату прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза.

Другі салдат падарваўся «на расцяжцы». Моцна пасекла асколкамі. Калі везлі ў шпіталь, зноў не пашанцавала: падбілі верталёт. Назло ўсяму выжыў, даслужыў тэрмін.

– Сяргей жа таксама вярнуўся з раненнямі, – кажа маці. – Двума раненнямі.

Два гады, тры месяцы і тры дні доўжылася афганская старонка С. Якуты. Не пакідала яго вера ў тое, што выжыве, што вернецца дамоў, да бацькоў, ва ўтульны домік над Прошай, да сваёй каханай, якой сачыняў пісьмы-прызнанні. Яны беражліва захоўваюцца ў скрынцы з-пад пячэння. Памкнуліся перачытаць – дзе там! Цэлая кніга атрымаецца. Шчырыя словы ад сэрца. Вось вытрымкі з некаторых пісем.

«Добры дзень, мілая, любая Олечка!!!

Вось толькі сёння атрымаў ад цябе пісьмо, за якое вялікі дзякуй. Адразу пішу зваротнае, хоць учора таксама напісаў пісьмо... Пішы мне ў той дзень, у які ўспамінаеш. А раз ты ўспамінаеш мяне пастаянна, значыць, я павінен атрымліваць пісьмы штодзень».

«Добры дзень, любая Олечка!

Учора прыехаў з граніцы, а мне ад цябе два пісьмы. Зайка, вялікі дзякуй. Я так узрадаваўся, прачытаў і з раніцы пішу адказ.

Олечка, я вельмі рады, што ў цябе ўсё нармальна, што ты кахаеш і чакаеш мяне».

«Дзень добры, мілая, любая Олечка!

...У мяне тут маленькае НЗ, не хацеў аб ім нічога казаць, ды вось табе адной усё ж такі магу, таму што ў мяне ад цябе сакрэтаў няма. Дык вось, Зайка, мне трапіў маленькі-маленькі асколак пад левае вока. Калі б крыху вышэй, было б горш».

«Зайка!!!

...Я ледзь не трапіў у бяду. На дарожным прыпынку на праезджую частку прама пад калёсы выбег хлопчык, я затармазіў, хлопчык спужаўся, паваліўся. Я спыніў машыну на адлегласці ў метр ад яго. Усё скончылася добра. Толькі рукі ў мяне пасля мінут дзесяць калаціліся».

«Зайка, я зараз хачу цябе ўбачыць і кожную мінуту хачу цябе бачыць. Я вельмі-вельмі цябе люблю, цалую мільён разоў».

«Мілая, любая! Учора цэлую ноч сніў цябе. Бачыш, Зайка, я ўжо і ў снах не развітваюся з табой. Мілая мая, ну калі я ўбачу ўжо цябе наяве!».

«Прывітанне з Душанбе!!!

Сёння шосты дзень, як я знаходжуся ў шпіталі, пакуль што добрага нічога няма. Рука не зажывае ні кропелькі. Будзем спадзявацца на лепшае. Зайка мая родная, як я хачу да цябе.

Олечка, у тым, што ты мяне дачакаешся, я не сумняваюся ні секунды. Ты мне гэта абяцала».

...Амаль кожны дзень – па пісьму. І так на працягу двух гадоў. Не перачытаць іх адразу. А варта, каб яшчэ і яшчэ раз парадавацца за моладзь, даведацца, як моцна яна можа любіць, быць вернай.

Заканчваўся тэрмін службы. Сяргей паведамляў, што вось-вось звольняць у запас. На радзіме чакалі яго нявеста, маці з бацькам. Здавалася, скончылася гэта нясцерпнае чаканне. І раптам...

Расказвае А. Якута.

– Пад Новы год праводзілі ў армію сына суседзяў. Ішлі вясёлай гурбой напрамую па Прошы, якую скаваў лёд. Недзе пасярод возера мяне дагнаў муж Аркадзь і кажа: «У ваенкамат

прывезлі Сяргея ў цынкавай труне...» Я бразнулася аб лёд, знямела. Вярнуліся дамоў. Назаўтра пайшла на тэлеграф, заказалі размову. Праз нейкі час паведамілі, што лінія сувязі абарвалася пасля Масквы...

Доўгі месяц жылі старэйшыя Якуты ў няведанні. Чакалі хаця б вестачкі «адтудь». Не зачынялі на ключ дзверы ноччу – раптам з'явіцца Сярожка... І цуд адбыўся. Лютаўскай поўначчу шырока расчыніліся дзверы. Апомнілася маці ў абдымках сына.

А пра смерць прыйшла чутка ці то з-за памылкі якой, ці то ад зламысніка.

Вядома, пасля былі сустрэчы з Оляй, якія скончыліся вяселлем.

...У Сяргея Якуты – прыемны голас. На заканчэнні размовы ён заспяваў песню, суровую песню.

У ёй расказвалася, як на вакзале да хлопца з ордэнам на грудзях падышла пажылая жанчына і сказала: «Мусіць, украў ці купіў». Ордэн заваяваны ў гарах Афгана. Такія ўзнагароды не прадаюцца і не купляюцца.

Пад канец песні маці прынесла другую скрыначку з узнагародамі сына. З павагай перабіраю ўзнагароды: два медалі «За баявыя заслугі», медаль «Ад удзячнага афганскага народа», медаль «Воіну-інтэрнацыяналісту», Грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. С. Якута мае знакі «Выдатнік пагранвойск» дзвюх ступеняў. Мае наручны гадзіннік, падораны калегіяй КДБ СССР.

Добра помню тэлеперадачу аб вывадзе савецкіх войскаў з Афганістана. Пакінуў Афган Сяргей Якута апошнім. Іх атрад ахоўваў выходзячыя калоны інтэрнацыяналістаў.

**А. Вашкевіч**

На здымку: ***Сяргей Якута (справа) з сябрам Аляксандрам Канопкам са Стай пасля звальнення ў запас***

Фота з сямейнага архіва